Фігуратыўная лепка майстра Зінаіды Ляйко з Лепеля напоўнена пачуццём дабрыні і пяшчоты. Майстар скульптуры стварае вобразы свойскіх жывёл: коней, кароў, катоў, а таксама дзікіх зайчыкаў і ваўчкоў. Падобныя выявы былі знойдзены археолагамі каля вёскі Гарошкава Гомельскай вобласці. Каты, зайцы, ваўкі Зінаіды Ляйко набылі чалавечыя рысы: дабрыню, кемлівасць, гумар. Многія свае творы майстар выконвала з грубага падручнага матэрыялу – бетону, які не патрабуе тэрмічнай апрацоўкі. Але ў пластыцы скульптуры галоўнае не матэрыял, а вобразы.

Класічная фальклорная тэматыка была ярка адлюстравана ў дробнай пластыцы майстра з Мазыра Мікалая Мікітавіча Пушкара, таленавітага мастака-кераміста, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, члена Саюза мастакоў СССР. Яго работы выкананы ў старадаўняй тэхніцы лепкі з пласта з распрацоўкай дэталяў сюжэту. Творы «Печаная бульба», «Дзед і баба», «Хворы Мацей» дакладныя ў сваіх «тэкстыльных» фактурах і адбітках тканін на паверхні скульптур. У ХХ ст. Мікалай Пушкар быў не толькі народным майстрам, ён быў вядучым спецыялістам у дробнай пластыцы, які ўплываў на развіццё прыкладнога мастацтва Беларусі.

Мікалай Пратасеня, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, працуе ў Салігорску. У вырабах мастака адлюстраваны шматлікія дэталі, якія паказваюць багацце аўтарскіх тэхнік і прыёмаў. Яго гліняная птушка варона, якая ў дзюбе трымае кавалачак калійнай солі, а па памерах можа змясціцца на далоні маленькага дзіцяці, стала сімвалам роднага горада Салігорска. Мікалай Пратасеня браў удзел у фестывалі-конкурсе свісцёлкі «Салавейка-2015» у рамках Міжнароднага фестывалю песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне», дзе атрымаў Гран-пры. Апошнім часам майстар-віртуоз вучыць малодшае пакаленне не забываць старажытнае майстэрства нашых продкаў.

Значную частку дробнай пластыкі беларускія майстры выконваюць у традыцыйнай стылістыцы, што прадстаўляе архаічны напрамак іх творчасці. Такія вырабы не маюць другарадных дэталяў і індывідуальных характарыстык персанажаў. Гэта, напрыклад, воіны Міраслава Раманоўскага з Івянца, якія выкананы традыцыйна, калі фігура чалавека зліваецца разам з канём. Так з даўніх часоў ляпілі ваяроў майстры-керамісты на тэрыторыі Беларусі. Народны майстар Міласлаў Раманоўскі жыве і працуе ў Івянцы. Там ён нарадзіўся і з'яўляецца сапраўдным носьбітам традыцый івянецкай керамікі і свісцёлкі. Ён скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, шматразова быў адзначаны дыпломамі на рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках-конкурсах, лаўрэат і стыпендыянт Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Яго работы вызначаюцца асабліва дасканалай лепкай, якая характэрна івянецкім майстрам папярэдняга пакалення.

Другім, больш позним напрамкам у развіцці дробнай пластыкі з'яўляецца наіўна-рэалістычная стылістыка. Яна характэрная для канца XIX і XX стагоддзя. У лепцы наіўна-рэалістычных жанравых сюжэтаў працуюць многія майстры Барысава, Любані, Мінска [1]. Свае здольнасці ў любым кірунку мастацтва керамікі ўвасабляе Дзяніс Гром. Музыкант і мастак у адной асобе віртуозна выконвае цацкі і музычныя гліняныя інструменты «акарыны». Ён працуе ў майстэрні керамікі музейнага комплексу старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі». Яго свісцёлкі і акарыны добра гучаць нават у сырым неабпаленым выглядзе. Іх пластыка абагульненая, разнастайная і вельмі матэрыяльная. Дзяніс Гром стыпендыят Фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, выпускнік кафедры народных рамёстваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Трансфармацыя традыцый у новым часе ў асобе майстра адбылася бездакорна.

Паспяхова выконвае задачу захавання традыцый яшчэ адзін выпускнік кафедры народных рамёстваў, Іван Дашкоў. Яго лепка дробнай пластыкі выканана ў традыцыйнай тэхналагічнай апрацоўцы гліны ў абвары і задымленні, з-за чаго музычна-керамічныя вырабы майстра становяцца асабліва выразнымі і архаічнымі.

Новае пакаленне майстроў дробнай пластыкі Беларусі працуе не толькі ў традыцыйным кірунку. Шматлікія сучасныя вырабы маладых творцаў створаны з наватарскімі і аўтарскімі прыёмамі лепкі і дэкору.

Народна-міфалагічнае светаразуменне захоўваецца, пераходзячы з эпохі ў эпоху. Яно паступова развіваецца і трансфамуецца, набываючы ўнікальныя і усеабдымная мастацкія каштоўнасці. Таму неабходна захоўваць гэтую сувязь для далейшага адраджэння, равіцця і рэканструкцыі традыцыйных напрамкаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

**Спіс літаратуры:**

1. Елатомцева, И. М. Художественная керамика советской Белоруссии / И. М. Елатомцева ; ред. М. Я. Гринблат ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : Наука и техника, 1966. – 190 с.
3. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1997. – 286, [1] с. : фот.
4. Сахута, Я. М. Цацка / М. Ф. Сахута // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1989. – С. 519-520.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мікалай Іваненка*

## АДРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ ВЫРАБУ ВЯСЕЛЬНАЙ ЛЯЛЬКІ НА ВІЛЕЙШЧЫНЕ

*У Вілейскай гімназіі №2 ўзноўлена мясцовая традыцыя выграбу вясельнай лялькі «Неразлучнікі». Такая лялька апошні раз выкарыстоўвалася ў вясельных рытуалах амаль сто гадоў таму. Традыцыя была страчана, але ёсць унікальны матэрыял для яе адраджэння.*

*Mikalay Ivanenko*

## REVIVAL OF TRADITIONS TO MAKE BRIDAL DOLLS IN VILEI-KA DISTRICT

*The local tradition of making a wedding doll «Not-to-tear-apart» is being re-newed in gymnasium No 2 of the town of Vileika. This kind of dolls was last used in wedding rituals almost a hun-dred years ago. The tradition was lost, but there is a unique material for its revival.*

Кожны куточак Беларусі мае сваю самабытную непаўторнасць. Адметнасць культурнай прасторы стварае своеасаблівы вобраз свету, у якім фарміруецца духоўны воблік чалавека. І таму надзвычай важна, каб кожны змалку

адчуваў сябе спадкаемцам культурнай спадчыны свайго народа. Зараз гэта магчыма толькі праз далучэнне дзяцей і падлеткаў да актыўнай дзейнасці па вывучэнні і зберажэнні нашай традыцыйнай культуры.

У Вілейскай гімназіі №2 ўзноўлена мясцовая традыцыя вырабу вясельнай лялькі «Неразлучнікі». Такая лялька апошні раз выкарыстоўвалася ў вясельных рытуалах амаль сто гадоў таму [2]. Традыцыя была страчана і ніхто на Вілейшчыне ўжо не памятае аб ёй. Выраб «Неразлучнікаў» стаў магчымым дзякуючы апрацоўцы запісаў этнаграфічных экспедыцый амаль дваццацігадовай даўніны. У аснову даследчай працы былі пакладзены звесткі, атрыманыя ад Любові Іванаўны Высоцкай – вёска Багданава, Аляксандры Дмітрыеўны Харэўкі – вёска Хамянцы, Дзіны Карлаўны Квяткевіч – вёска Талуць.

«Нявесту шукае чалавек, а жонку дае Бог» [2] – так казалі ў народзе з верай, што шлюбы адбываюцца на нябёсах. У некаторых вёсках на Вілейшчыне рабілі да вяселля саламяныя лялькі-абярэгі: «Ён і Яна», «Манька і Іванька». А яшчэ ў каравай ўторквалі ляльку «Малады і Маладая», умацаваныя на рагульцы (разгалінаванай надвая галінцы) [2]. Гэта і ёсць прыклады вясельнай лялькі «Неразлучнікі», якую яшчэ называлі «Адзінаручка». У вёсках за Талуццю такую лялькy рабіла сяброўка маладой. Яна павінна была быць у добрым настроі і на кожны вузельчык выказваць пажаданні шчасця, поспехаў, даверу, радасці, багацця, з’яўлення дзяцей і іншае. Ляльку рабілі не больш за 15 – 20 см у вышыню і калі маладых везлі вянчацца, то ў вясельнай вупражы яе мацавалі на дугу над цэнтральным канём (калі была тройка коней). Верылі, што лялька аберагае маладых ад сурокаў і адганяе злыя сілы. Пасля вяселля лялька захоўвалася ў сям’і [2].

«Неразлучнікі» – сімвал паразумення і любові. Адна агульная рука на дваіх азначае еднасць ва ўсім: адны мэты, адны жаданні, агульная праца, непарыўнае жыццё. Па сутнасці дзве лялькі, звязаныя разам, а гавораць пра іх як пра адну ляльку. Гэта сугучна Свяшчэннаму Пісанню (па словах апостала Паўла): «Пакіне чалавек бацьку свайго і маці і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое адным целам» [Ефс., 5:31]. Рука агульная, а вось галава – у кожнага свая. Гэта азначае, што кожны чалавек вольны ў выбары, але павінен разважліва ставіцца да жыцця і да сваёй ролі ў сям’і. Аб еднасці мужа і жонкі, аб іх уплыве адно на аднаго гавораць нам мноства прыказак і прымавак: «Які Хомка, такая і жонка» [1, с. 148], «Гаспадар і жонка – найлепшая сполка» [1, с. 129], «Як муж з жонкай сварыцца – ў печы трасца варыцца» [2], «Там, дзе згода, добрая прыгода» [1, с. 94].



Малюнак 1 – Вясельныя лялькі Вілейшчыны, каркас

Так як і ў даўніну, мы пачалі рыхтавацца да вырабу вясельнай лялькі «Неразлучнікі» загадзя. Спачатку падрыхтавалі ўсе неабходныя матэрыялы і спланавалі работу, раздзяліўшы яе на тры асноўныя этапы: выраб каркаса, шыццё адзення і выраб абутку, адзяванне і аздабленне лялькі.

Па сведчаннях жыхароў вёсак, амаль кожны рух у працы над «Неразлучнікамі» мае рытуальнае значэнне. А гэта значыць, што калі штосьці зробіш не так (парушыш паслядоўнасць дзеянняў або не тыя словы ці думкі дапусціш), то магічная абарончая сіла лялькі будзе страчана часткова ці цалкам. Мы, канешне, не язычнікі, і таму на магічныя акалічнасці не звярталі ўвагі. Сама праца над вырабам лялькі ў эстэтычным плане цікавая і вельмі прыцягальная. Мы стараліся рабіць усё так, як бы рабіла колішняя маці для сваёй дачкі, паслядоўна выконваючы ўсе віды дзеянняў, каб атрымалася сапраўдная вясельная лялька, на якую было б не сорамна самім паглядзець і людзям паказаць.

Для вырабу каркаса лялькі можна было выкарыстоўваць дрэўкі або галінкі з любой ліставой пароды, акрамя асіны. Па народных павер’ях асіна лічылыся нядобрым дрэвам [2]. Нават на дровы яе стараліся не ўжываць, бо асінавае паленне моцна трашчыць, адшчэльвае вугалькі і выкідае іх з печы, што можа стаць прычынай пажару. Мы выкарысталі бярозавыя дрэўкі даўжынёй 60 см на агульную руку і па 25 см на перакрыжаванні. Раней дрэўкі не збівалі цвікамі, яны мацаваліся ніткамі, наматанымі накрыж. Звязаныя галінкі ці дрэўкі абмотвалі суцэльнай ніткай, спрадзенай з лёну ці канопляў. Канцы ніткі хаваліся, каб іх не было відаць, што сімвалізуе схаванасць сямейных таямніц ад чужых вачэй. Спачатку драўляную аснову змазвалі смолкай з вішні ці слівы, мёдам або салодкай вадой. Пачынаючы з галавы «мужа» (у сям’і ўсё залежыць ад яго розуму) і маскіруючы канец ніткі, аснову шчыльна ўкручвалі да перакрыжавання (грудзей), затым ішлі па суцэльнай руцэ да правай рукі «жонкі» (ад яе працавітасці залежыць дабрабыт у хаце). Затым вярталіся (уся аснова павінна быць абкручана ўдвая) да грудзей «жонкі», ішлі далей да галавы і зваротна да самага нізу, потым назад да грудзей і праз суцэльную руку да левай рукі «мужа». Такім чынам першым бывае абкручаны каркас жаночы, што сімвалізуе клопат і ахову яе з боку мужа. З левай рукі мужчыны вярталіся да нізу і падымаліся да галавы, што зноў жа сімвалічна сцвярджае: апошняе слова ў сям’і заўсёды належыць мужу. Край ніткі не адразалі, а адкусвалі і маскіравалі, каб не было відаць. Абвіваючы



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каркас, майстрыха ўвесь час прыгаворвала: «Каб галоўка светлай была, душы не страдалі, ручкі стомы не зналі, утроба не балела, дзетак нараджала і ў шчасці спявала» [2]. Нітка прыставала да змазанага дрэўка, і праз некалькі гадзін яе немагчыма ўжо было адарваць.



Малюнак 2 – Вясельныя лялькі Вілейшчыны, адзенне і аздабленне

Наш каркас для лялькі мы абкручвалі ніткай па ўсіх правілах, толькі без прыгаворак і ён атрымаўся даволі моцным, як таго і патрабуе адпрацаваная народам тэхналогія вырабу вясельнай лялькі.

Пасля завяршэння працы над каркасам (мал. 1) мы прыступілі да шыцця і аздаблення адзення жаночага і мужчынскага, стараючыся прытрымлівацца вядомых нам правілаў адносна Вілейскага строю. Хаця адзенне не з'яўляецца застылай катэгорыяй і з развіццём грамадства пастаянна мяняецца, яго крой, характар упрыгожванняў, тэрміналогія вельмі ўстойлівыя. Поўны ансамбль Вілейскага строю і кожная з яго частак – гэта сапраўдныя творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва [4, с. 43].

У працы над адзеннем і абуткам нам вельмі спатрэбіліся ранейшыя напрацоўкі. Некалькі гадоў таму ў гімназіі быў адноўлены рэгіянальны святочны касцюм і зараз без асаблівых цяжкасцей мы змаглі вырабіць святочную вопратку для вясельнай лялькі, блізкую да арыгіналу (мал. 2).

Абуваць лялькю можна было і ў чобаты ці чаравікі, але мы наўмысна выбралі лапці. Гэта, бадай, адзін з самых цікавых атрыбутаў сялянскага вобразу. Белыя анучкі і ільняныя аборы – сціпла і вельмі прыгожа. Да таго ж лапці – самы натуральны і самы экалагічны абутак.

Калі гаварыць аб асаблівасцях аздаблення, то трэба адзначыць, што вясельная лялька галоўным чынам упрыгожана святочнымі строямі, каляровымі перакрыжаваннямі на тварах, прыгожымі паясамі і галаўнымі ўборамі. Але ёсць яшчэ адзін атрыбут аздаблення, які мае вельмі сімвалічнае значэнне. Гэта рушнік, якім як бы звязаны рукі «Неразлучнікаў». Ён сімвалізуе жыццёвую дарогу, яе чысціню. Рушнік мацуецца паміж мужам і жонкай з сімвалічным напамінам пра роўную адказнасць кожнага за сумесны жыццёвы шлях [2].

Цікава, што з цягам часу ляльку можна было даўпрыгожваць. Калі ў сям'і з'яўляліся дзеці, то на рушнічку паміж мужам і жонкай прымацоўвалі маленькіх лялечак-дзетак. Гэта, бадай, самае значнае і велічнае аздабленне вясельнай лялькі ды і самога жыцця тых, для каго яна была зроблена [2]. Жаночую ляльку даўпрыгожвалі пацеркамі. Як узнагароду за працавітасць і мірны дух іх маглі прычапіць да жаночага боку лялькі свякроў або муж. Мужчынскі бок лялькі магла даўпрыгожыць яркім поясам толькі жонка. Калі адзенне на лялцы запыльвалася, яго можна была абнавіць, адзеўшы новыя рэчы паверх, не здымаючы старых. А яшчэ на галаву мужчыны замест матузка, які прыціскаў валасы, можна было пашыць шапку як знак увагі і пашаны ад жонкі [2].

На Вілейшчыне, па словах Л. І. Высоцкай, рабілі даволі вялікія (да 50 см у вышыню) і прыгожыя лялькі «Неразлучнікі» з новых тканін і з мастацкім аздабленнем. Такую ляльку маглі рабіць за некалькі дзён. Яе шыла маці маладой або сяброўкі, але сяброўкі, занятыя на вырабе лялькі, павінны быць здаровымі і прыгожымі, з поўных і шчаслівых (шматдзетных і заможных) сем'яў, не сіроты [2].

На вяселлі ляльку выносілі да гасцей перад вынасам каравая сёстры маладога або дружкі. Яе падвешвалі на покуці пад абразамі за спінамі маладых. Пасля вяселля «Неразлучнікаў» маглі схаваць у куфар з пасагам нявесты, або (і часцей) прымацаваць над ложкам маладых, дзе яна вісела доўгія гады.

Шкада, што мала звестак захавалася ў нашым рэгіёне пра такі найцікавейшы кірунак народнай творчасці, як стварэнне лялек рознага прызначэння. Дзякуючы нашаму праекту мы змаглі занатаваць тое нямногае, што па крупіцах сабрана і магло быць назаўсёды страчана.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Я. Янкоўскі ; прадм. Д. Я. Бугаёва. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 494 с.
2. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый (запісы 1998 – 2015 гадоў) / асабісты архіў М. М. Іваненкі. – Вілейка.
3. Народные куклы. Народные игрушки [Электронны рэсурс]. – 2015. – Рэжым доступу : http://www.rukukla.ru. – Дата доступу : 17.12.2016.
5. Тучэц, Л. В. Вілейскі строй / Л. В. Тучэц // Культурны ландшафт Вілейшчыны : матэр. Вілейскай рэгіянальнай навук.-практ. канф. (26-27 ліпеня 2003 г.). – Мінск, 2004. – С. 41–44.
6. Церашковіч, Т. А. Лялька беларуская / Т. А. Церашковіч. – Мінск : Полымя, 1992. – 62 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ